## 2 ФЕМІНІСЦКІ ЛІТАРАТУРНЫ КРЫТЫЦЫЗМ І ГЕНДАРНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

1 Адрозненні паміж гендарнымі даследаваннямі і фемінісцкім літаратурным крытыцызмам. Тапалогія жанчын і іх гендар.

2 «Жаночая літаратура», «жаночае чытанне» як разнавіднасці метаду фемінісцкага літаратурнага крытыцызму.

3 «Жаночае пісьмо» і «жаночая аўтабіяграфія» як разнавіднасці метаду фемінісцкага літаратурнага крытыцызму.

4 Пол аўтара і чытача, стыль і змест тэксту – цэнтральныя катэгорыі ў фемінісцкім літаратурным крытыцызме.

### 1 Адрозненні паміж гендарнымі даследаваннямі і фемінісцкім літаратурным крытыцызмам. Тапалогія жанчын і іх гендар.

**Гендарныя даследаванні** маюць на мэце вывучэнне сацыяльных, культурных, эканамічных, прававых, моўных і іншых праблем у перспектыве полу. Падставай для такога падыходу з’яўляецца паняцце гендара. На сённяшні дзень «гендар» (англ. gender – род, часцей за ўсё граматычны) трактуецца як «паняцце, якое выкарыстоўваецца ў сацыяльных навуках для адлюстравання сацыякультурнага аспекта полавай прыналежнасці чалавека». Як катэгорыя аналізу ён уведзены параўнальна нядаўна. Першапачаткова ў англа-амерыканскіх краінах тэрмін «гендар» выкарыстоўваўся для «апісання граматычнай катэгорыі роду», ужыванне яго па-за межамі граматыкі разглядалася як жарт ці грубая памылка. Пашырэнне значэння тэрміна «гендар» звязана з развіццём тэорыі фемінізму, жаночага руху за роўныя правы з мужчынамі. Гэты рух узнік у XVIII ст., актывізаваўся ў канцы 60-х гадоў XX ст. пад назвай неафемінізму як выражэнне пратэсту супраць сацыяльнага прыгнёту жанчыны, яе дыскрымінацыі ў эканамічным і палітычным жыцці, у сям’і, супраць прыніжэння яе годнасці. Так, у 70-я гады мінулага стагоддзя выкарыстанне тэрміна «гендар» прадугледжвала ўжо вывучэнне жанчын з пункту гледжання жанчын. З пачатку 80-х – герменеўтыка гендара зноў змянілася. Вывучэнне жаноцкасці стала немагчымым без аналізу мужчынскасці. Гэты тэрмін стаў успрымацца не як канцэптуалізацыя мужчынскага дамінавання, а як разуменне яго ў якасці сістэмы, «якая ў розных формах прысутнічае, канструюецца і ўзнаўляецца ва ўсіх сацыяльных працэсах». Гендарныя пошукі пачалі ўспрымацца як даследаванні ўсіх форм узаемадзеяння і «ўзаемаадштурхоўвання» мужчынскага і жаночага (інакш кажучы суіснавання мужчын і жанчын) ва ўсіх культурах і грамадствах, а таксама як суадносіны тыпаў мужчынскага і жаночага, характэрных для канкрэтнага соцыуму.

Як ужо згадвалася, гендарныя даследаванні сваім узнікненнем абавязаны развіццю тэорыі фемінізму. Узнікненне апошняй абумоўлена патрыярхатнай культурай, якая памясціла «палову чалавецтва за межы, за рамкі гэтай культуры» [30, 9]. Але не толькі. Вылучэнне гендарных даследаванняў у асобную міждысцыплінарную галіну і ўвядзенне курсаў, якія ім адпавядаюць, ва універсітэцкія праграмы адбылося і дзякуючы развіццю грамадства ўвогуле. У 80-я гады склалася новая канцэпцыя асабістай аўтаноміі, а таксама сфармаваліся некаторыя сучасныя сацыяльныя тэндэнцыі: урбанізацыя; аслабленне сямейнага кантролю і кантролю старэйшых пакаленняў за паводзінамі моладзі; значны прырост насельніцтва, у сувязі з чым аслабла неабходнасць у ідэалогіі праслаўлення мацярынства як галоўнай жаночай функцыі; хваля барацьбы за правы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

асобных груп насельніцтва (жанчын, неграў, сексуальных меншасцяў) і свабоду народаў (за вызваленне Афрыкі, супраць вайны ва В'етнаме і г.д.), узнікненне субкультур бунту і пераадольвання стэрэатыпаў; практыка шырокага абмеркавання праблем сексуальнасці і сексуальнай свабоды. Доступ да прафесійнай ці акадэмічнай кар'еры даў жанчынам эканамічную незалежнасць (фізіялагічныя адрозненні полаў перасталі мець значэнне, бо ў выніку тэхналагічнага прагрэсу змяніўся характар працы). Колькасць жанчын сярод студэнтаў і выкладчыкаў ВНУ рэзка павялічылася. Менавіта феміністкае акадэмічнае асяроддзе сфармулявала некаторыя асноўныя праблемы гендарных даследаванняў, якія паступова змянілі не толькі навуковы, але і грамадскі дыскурс у краінах еўрапейскай цывілізацыі.

Змяненне значэння паняцця «гендар» звязана і з развіццём гендарнай тэорыі, у якім вызначаюць некалькі этапаў.

Першы прыпадае на другую палову 70-х гадоў мінулага стагоддзя і характарызуецца як «жаночыя даследаванні». Рэвізія традыцыйных гуманітарных і сацыяльных навук пачалася з пастаноўкі пытання, наколькі ўсе яны аб'ектыўныя з пункту гледжання полу. На думку даследчыкаў, той факт, што да гэтага часу асноўным суб'ектам як гісторыі чалавецтва, так і навукі з'яўляўся мужчына, не мог не прывесці да скажэнняў у адлюстраванні карціны свету. Чалавек абстрактна атаясамліваўся з мужчынам, жанчына вывучалася з мужчынскага пункту гледжання. Яе сацыяльны вопыт не браўся пад увагу. У ранг абсалютных узводзіліся мужчынскія каштоўнасці, яны і абвяшчаліся агульначалавечымі. Па-сутнасці, гэта былі мужчынскія даследаванні (men's studies) без усведамлення іх аднабаковасці. Жаночыя даследаванні (women's studies) вылучыліся як асобная дысцыпліна са сваім прадметам вывучэння – жанчына з пункту гледжання жанчыны. Пры гэтым значнае месца ў іх адводзілася тэорыям, што тлумачылі ўзнікненне і канструяванне полавай няроўнасці і дыскрымінацыі. У залежнасці ад накірунку феміністкай думкі (ліберальны, радыкальны, марксісцкі, экзістэнцыялісцкі, псіхааналітычны) і акадэмічнай дысцыпліны (антрапалогія, сацыялогія, эканоміка, культура і інш.) фармуюцца мадэлі і тэорыі, у якіх ключавымі лічацца пытанні жаночай сексуальнасці і кантролю над ёй, дзетараджэння і мацярынства, асобай жаночай этыкі – этыкі клопату, сацыяльных прычын і механізмаў, пры дапамозе якіх фізіялагічная здольнасць жанчын да дзетараджэння трансфармуецца ў няроўнасць у сацыяльнай і культурна-сімвалічнай сферах.

Другі этап прыпадае на 80-я гады. Для яго характэрна станаўленне менавіта гендарнай тэорыі, таму вызначыць гэты этап правамоцна як «гендарныя даследаванні». У гэты час быў здзейснены пераход ад аналізу патрыярхату і спецыфічнага жыццёвага вопыту да аналізу гендарнай сістэмы. На першы план пачынаюць вылучацца падыходы, згодна з якімі ўсе аспекты чалавечага грамадства, культуры і ўзаемаадносін з'яўляюцца гендарнымі. Апошнія дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад гістарычнага часу, расы, нацыянальнасці, класавай прыналежнасці, рэлігіі, дзяржаўнай арганізацыі, грамадскіх інстытутаў, прыярытэтных стэрэатыпаў паводзін у грамадстве, сексуальнай прыналежнасці, але існуюць заўсёды. Увогуле канструяванне гендарнасці можна лічыць працэсам бясконцым і няспынным. Сучасны фемінізм як ідэалогія лічыць, што цэнтральнымі паняццямі ў апісанні адносін улады і культурных катэгорый з'яўляюцца пытанні гендара. Таму ён абвяшчае галоўнай мэтай пазбаўленне ад ролевай спецыялізацыі ў грамадстве па прыкмеце полу. Гендарныя ж даследаванні як метадалогія і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навуковая дысцыпліна накіраваны на стварэнне новай навуковай парадыгмы, вольнай ад патрыярхатных стэрэатыпаў (калі прызнаць, што веды сацыяльна дэтэрмінаваныя).

Наступны, трэці этап у развіцці гендарных даследаванняў – 90-я гады мінулага стагоддзя – характарызуецца распаўсюджваннем гендарнай тэорыі ў краінах былога сацлагера і на постсавецкай прасторы. Гендарныя даследаванні ў гэтых краінах развіваюцца вельмі імкліва, яны ахапілі літаральна ўсе сферы навукі і культуры, не пакінулі ў спакоі нават філасофію. І толькі ў апошнія гадоў восем пра іх загаварылі ў Беларусі. Тым не менш, ужо створаны цэнтры (ЕГУ, Энвіла), выдаюцца часопісы («Иной взгляд») і бюлетэні, праводзяцца канферэнцыі, выдаюцца зборнікі матэрыялаў па гендарнай праблематыцы.

Нягледзячы на адносна працяглы тэрмін развіцця тэорыі гендара, няма адзінага разумення і выкарыстання як самога паняцця «гендар», так і метадаў даследавання. Побач з такімі азначэннямі тэрміна «гендар», як сацыякультурная канструкцыя полу/сексуальнасці, узаемаадносіны полаў, выкарыстоўваюцца і наступныя: гендарныя стэрэатыпы, пола-ролевыя нормы, пола-ролевая ідэнтычнасць. Тры апошнія характарыстыкі аб'ядноўваюць у паняцце «гендарны дысплей» (англ. display – праяўленне), якое ўвабрала ў сябе шматлікія і разнастайныя праяўленні «культурных складнікаў полу» – нормы і стэрэатыпы, якія навязвае грамадства, а таксама шляхі сацыялізацыі і ідэнтыфікацыі. Паняцці «сацыяльная і культурная канструкцыя полу», «узаемаадносіны паміж поламі» і г. д., у адрозненне ад тэрміна «гендар», існуюць столькі, колькі існуе чалавецтва. Літаратура як адзін з відаў мастацтва і адлюстравання рэчаіснасці яркае таму сведчанне. Дастаткова ўзгадаць міф пра Пандору ці стварэнне Богам Адама і Евы і іх «грэхападзенне», якія і цяпер вызначаюць узаемаадносіны полаў у жыцці і культуры.

Маскоўскі цэнтр гендарных даследаванняў, на аснове сістэматызацыі распрацовак заходніх даследчыкаў, вылучае тры асноўныя тэорыі гендара: «1) тэорыя сацыяльнага канструявання гендара; 2) гендар як стратыфікацыйная катэгорыя; 3) гендар як культурная метафара».

У межах першай тэорыі гендар разумеецца як арганізаваная мадэль сацыяльных адносін паміж жанчынамі і мужчынамі, якая канструюецца галоўнымі інстытутамі грамадства. Яна заснавана на наступных пастулатах: гендар канструюецца пасродкам сацыялізацыі, падзелу працы, сістэмай гендарных роляў, сем'яў, сродкамі масавай інфармацыі; гендар будуецца таксама самімі індывідамі – на ўзроўні іх свядомасці, прыняцця зададзеных грамадствам норм і падладжвання пад іх. Іншымі словамі, гендарная прыналежнасць індывіда праяўляецца ў тым, што чалавек робіць пастаянна ў працэсе ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі.

Згодна з другой тэорыяй гендар стварае іерархію сацыяльных адносін і роляў паміж мужчынамі і жанчынамі, таму ён – катэгорыя стратыфікацыйная. Такімі ж катэгорыямі з'яўляюцца клас, раса, узрост. Іншымі словамі, гендар – гэта працэс, які канструюе сацыяльна-нарматыўны суб'ект праз пабудову адрозненняў па полу, што звязаны ў сваю чаргу з расавымі, этнічнымі, сацыяльнымі.

Трэцяя тэорыя гендара сцвярджае, што мужчынскае і жаночае на быційным і пазнавальчым узроўнях існуюць як элементы культурна-сімвалічных радоў. У гэтых радах мужчынскае вызначаецца як рацыянальнае, духоўнае, боскае, культурнае... і лічыцца значным, пазітыўным, дамінантным. Жаночае ж заўсёды пачуццёвае, цялеснае, грахоўнае, прыроднае... і лічыцца негатыўным, другасным, падаўляемым.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пры гэтым адзначаецца, што многія, не звязаныя з полам, рэчы і паняцці атаясамліваюцца з «мужчынскім» або «жаночым», набываюць гендарную афарбоўку.

Хаця тэорыі гендара, прапанаваныя Варонінай В.А.(МЦГД), не носяць універсальнага характару, усё ж некаторыя з іх мы будзем выкарыстоўваць пры аналізе мастацкіх твораў.

**Феміністкі літаратурны крытыцызм** (як і гендарныя даследаванні) узнік пад уплывам неафемінізму ў межах жаночых даследаванняў. Навукоўцы-феміністы/ткі пачалі займацца маргінальным статусам жанчыны ў грамадстве і змаглі прывязаць свае даследаванні да традыцыі разваг пра «жаночы пачатак», што мае глыбокія карані. Для разумення жаночага пытання ў яго грамадска-палітычным значэнні стала немагчымым далейшае выкарыстанне паняцця прыроды жанчыны ў якасці абгрунтавання яе падпарадкавальнай ролі.

Гендарныя даследаванні, як ужо адзначалася, прымяняюць метады феміністкага літаратурнага крытыцызму, які вылучыў і распрацоўвае праблемы жаночай тапалогіі (агульных, нязменных уласцівасцей жанчын) наогул і ў літаратуры ў прыватнасці. Феномен феміністкага літаратурнага крытыцызму атрымаў вялікае распаўсюджванне ў Заходняй Еўропе і ЗША ў апошнія тры з паловай дзесяткі год. Асноўнай мэтай дадзенага праекта, на думку даследчыцы І. Жаробкінай, была пераацэнка традыцыйнага літаратурнага канону «вялікіх» літаратурных тэкстаў з пункту гледжання жаночага аўтарства і жаночага чытання. Як філасофска-тэарэтычная сістэма, феміністкі літаратурны крытыцызм можа быць арыентаваны па-рознаму, але агульным для ўсіх яго разнавіднасцей застаецца прызнанне своеасаблівага спосабу жаночага існавання ў свеце і жаночых рэпрэзентатыўных стратэгій, якія яму адпавядаюць. Феміністкі літаратурны крытыцызм выступае супраць традыцыйных / мужчынскіх каштоўнасцей інтэлектуальнай культуры, якія сканструявалі жаночы вопыт існавання другасным, неістотным, а таму такім, які падаўляецца і з'яўляецца «болевым» у традыцыйнай культуры. Гэты напрамак выпрацаваў сваю, альтэрнатыўную традыцыйнай, тэорыю аналізу жаночай літаратуры і вызначыў асноўную тэарэтычную праблему – праблему жаночай суб'ектыўнасці. У яе трактоўцы існуюць два канцэптуальныя падыходы:

- вызначэнне жаночай суб'ектыўнасці праз катэгорыю «інакшасці» («іншае» ў адносінах да мужчынскага і традыцыйнага);
- вызначэнне структуры жаночай суб'ектыўнасці па-за ўсякімі суадносінамі з вонкавым «другім» – г.зн. праз пабудову асабістай, незалежнай і унікальнай тапалогіі «жаночага».

Тэарэтыкі феміністкага літаратурнага крытыцызму падзяляюць яго на наступныя асноўныя разнавіднасці, «якія вельмі цесна звязаны паміж сабой і даволі цяжка паддаюцца дыферэнцыяцыі (у іх, хутчэй, можна выдзеліць розную акцэнтоўку): 1) жаночая літаратура – акцэнт ставіцца на пол аўтара; 2) жаночае чытанне – акцэнт ставіцца на пол чытача; 3) жаночае пісьмо – акцэнт ставіцца на стыль тэксту; 4) жаночая аўтабіяграфія – акцэнт ставіцца на змест тэксту» [44, 138].

Сёння феміністкі літаратурны крытыцызм існуе на стыку некалькіх крытычных падыходаў і накірункаў – структуралісцкага, постструктуралісцкага, культурна-сацыялагічнага і псіхааналітычнага. Аднак менавіта постструктуралісцкія канцэпцыі 80-90-х гадоў мінулага стагоддзя з'яўляюцца найбольш прадуктыўнымі для абгрунтавання феміністкай тэорыі пра спецыфіку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жаночай свядомасці і жаночай мовы, жаночага пісьма і літаратуры. Эфект уздзеяння феміністкага літаратурнага крытыцызму ў літаратурнай тэорыі і культуры на зыходзе ХХ – пач. ХХІ стст. цяжка перабольшыць. Можна сказаць, што на сённяшні дзень не існуе практыкі чытання літаратурнага ці філасофскага тэксту, якая б не ўлічвала яго магчымую гендарную ці феміністкую інтэрпрэтацыю.

**2 «Жаночая літаратура», «жаночае чытанне» як разнавіднасці метаду феміністкага літаратурнага крытыцызму.**

*а) паняцце «жаночай літаратуры»: тэарэтычныя падыходы*

Асноўная задача феміністкага аналізу літаратуры, на думку Э.Шоўолтэр (рэдактара кнігі «Новы феміністкі крытыцызм»), «памяшчаць у цэнтр крытычнага даследавання як жанчыну-чытача ці жанчыну-гераіню (праблематыка «жаночай літаратуры»), так і жанчыну-пісьменніцу як вытворцу тэкстуальных значэнняў (праблематыка «жаночага пісьма»). У кантэкст праблемы «жаночай літаратуры» ўваходзіць вывучэнне тэм, жанраў і структур літаратуры, створанай жанчынамі; у лік прадметаў – псіхадынаміка жаночай крэатыўнасці, лінгвістыка і праблема жаночай мовы, траекторыя індывідуальнай альбо калектыўнай жаночай кар’еры, гісторыя літаратуры і даследаванні асобных пісьменніц і іх твораў». У названай кнізе, дзе сабраны работы па паэтыцы фемінізму, што на сённяшні дзень лічацца класічнымі, падкрэсліваецца наступнае: «Для крытыкаў-жанчын новая арыентацыя літаратурнага крытыцызму заключаецца ў тым, каб звяртаць асаблівую ўвагу не на праблемы героя, а на праблемы гераіні... і на тыя своеасаблівыя абставіны, у якіх яна апынулася». Як прыклад у кнізе падаецца аналіз рамана «Джэн Эйр» Ш.Брантэ, зроблены М.Адамс. «Перачытваючы гэты твор я непазбежна прыходзіла да чыста жаночых пытанняў, пад якімі я разумею грамадскае і эканамічнае становішча залежнасці жанчыны ў шлюбе, абмежаваны выбар магчымасцей, што даступны Джэн, як следства яе адукацыі і энергіі, яе жаданне кахаць і быць каханай, адчуваць сябе патрэбнай і карыснай. Гэтыя імкненні гераіні, дваістыя адносіны да іх апавядальніцы і канфлікты паміж імі – вось тыя сапраўдныя пытанні, што ўздымаюцца самім раманам», – піша аўтарка.

Адным з метадаў феміністкага літаратурнага крытыцызму, які вылучае Э.Шоўолтэр, з’яўляецца «гінакрытыка» – гэта калі жанчына з’яўляецца аўтарам тэксту і вытворцай тэкстуальных значэнняў. «Гінакрытыка» стварае новыя тыпы жаночага дыскурсу незалежна ад мужчынскага і адказваецца ад простай адаптацыі мужчынскіх літаратурных тэоый і мадэлей. «Гінакрытыка», па словах Шоўолтэр, пачынаецца тады, калі мы вызваляем сябе ад лінеарнай і абсалютнай мужчынскай літаратурнай гісторыі, перастаём упісваць жанчыну ў прасветы паміж лініямі мужчынскай літаратуры і замест гэтага факусіруемся на новым бачным свеце ўласна жаночай культуры». Вялікае значэнне ў праекце такога тыпу мае даследаванне жаночай субкультуры як ўзаемаадносін жанчын у якасці маці, дачок, сясцёр і сяброў, а таксама даследаванне жаночай сексуальнасці і тапалогіі жаночага цела.

*б) паняцце «жаночага чытання»*

У 70-я годы ХХ ст. бартаўскі тэзіс аб змяненні палітык літаратуры з вытворчасці тэкстаў на іх успрыняцце (смерць аўтара азначала нараджэнне чытача) стаўся вельмі плённым для феміністкага літаратурнага крытыцызму з пункту гледжання магчымасці мадыфікацый адзіных і агульнапрынятых у «вялікай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

літаратуры» тэкставых значэнняў. У фемінісцкім літаратурным крытыцызме пад уплывам Ж.Дэрыда ўзнікае своеасаблівая праблема «жаночага чытання» і «жаночага чытача». «Працэдура перцэпцыі (успрыняцця – Т.Ф.) дазваляе выявіць множнасць і амбівалентнасць тэкставых структур, а значыць, акрэсліць месца і для спецыфікі жаночай рэцэпцыі тэкста, фактычна, акрэсліць тапалогію жаночай суб'ектыўнасці». Такім чынам, было выяўлена, што цяпер любы тэкст можа быць прааналізаваны з фемінісцкага пункту гледжання.

Найбольш сістэматычна прынцыпы разумення «жаночага чытання» ў фемінісцкім літаратурным крытыцызме выразіла А.Калодны ў артыкуле «Карта для перачытвання: гендар і інтэрпрэтацыя літаратурных тэкстаў», змешчанай у кнізе «Новы фемінісцкі крытыцызм». Яна лічыць, што:

«Па-першае, жаночае чытанне менш абстрактнае, чым мужчынскае: жанчына заўсёды чытае ў тэксце свой асабісты рэальны жыццёвы эксперымент. Вынікам такога чытання становіцца яе асабісты тэкст, літаральна – яе «я» як тэкст. Жаночае чытанне – гэта дэшыфроўка і выяўленне сімвалізацый звычайна падаўленай і недасягальнай жаночай рэальнасці і «ўпісванне» яе затым у сваё паўсядзённае жыццё.

Па-другое, у працэдуры чытання жанчына звычайна адчувае сітуацыю падаўлення яе пачуццяў і супраціўляецца гэтаму падаўленню сілай асабістага афекта.

Па-трэцяе, у жаночым чытанні асаблівая ўвага звяртаецца на жаночыя вобразы і жаночыя сітуацыі, якія мужчынамі дэшыфруюцца як другасныя і нязначныя».

«Перачытваючы тэкст, жанчына-чытач мае магчымасць гуляць з разнастайнымі сэнсамі гэтага тэксту і дасягаць тым самым незалежнасці ад традыцыйных катэгорый і паняццяў, г.зн. ад маскулінісцкіх ацэнак культуры».

**3 «Жаночае пісьмо» і «жаночая аўтабіяграфія» як разнавіднасці метаду фемінісцкага літаратурнага крытыцызму.**

*в) паняцце «жаночага пісьма»*

Асноўныя трансфармацыі ў фемінісцкім літаратурным крытыцызме перажывае постструктуралісцкае паняцце «пісьмо». Пад уплывам філасофіі Ж.Дэрыда «пісьмо, а таксама літаратура» абʼяўляюцца феноменам, што мае жаночую прыроду, г.зн. здольнасцю пазбегнуць мужчынскіх дамінанат логацэнтрызму.

Фемінісцкія аўтары вылучаюць два асноўныя тыпы выкарыстання мовы: рацыянальны і выразны, пачуццёвы. Жаночыя тыпы мовы і пісьма адносяцца да стратэгій выразнай мовы – той, што выходзіць за межы «моўных матрыц устаноўленных значэнняў». Э.Сіксу лічыць, што толькі ў выпадку, калі карыстаешся другім тыпам мовы, можна выявіць існаванне «цела»: пачуццёвага стварэння, якое не паддаецца рацыянальнаму асэнсаванню. Мужчына заўсёды кантралюе свае імпульсы, жанчына – не. «Пісаць тэкст для мужчыны – значыць карыстацца закончанымі фармулёўкамі і паняццямі; пісаць тэкст для жанчыны – значыць доўжыць сітуацыю незавершанасці і бясконцасці ў тэксце. У жаночым тэксце няма і не можа быць ні пачатку, ні канца; такі тэкст не паддаецца прысваенню». На думку Э.Сіксу, катэгорыі традыцыйнай мовы мяшаюць непасрэдна ўспрымаць акаляючы свет, бо накладваюць на яго «сетку апрыёрных паняццяў ці азначэнняў». У жаночым успрыняцці свету (як і ва ўспрыняцці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзіцяці), лічыць даследчыца, пераважаюць не катэгорыі мужчынскага рацыянальнага мыслення, але экстатычная («цялесная») камунікацыя са светам, якая складаецца ў першую чаргу з адчуванняў колеру, паху, смаку. Іншымі словамі, жаночая камунікацыя са светам – гэта камунікацыя фізічнага цела з фізічным светам рэчаў.

*г) жаночая аўтабіяграфія*

Жанр аўтабіяграфіі побач з жанрамі дзённікаў і мемуараў традыцыйна адносіцца да «жаночых» жанраў пісьма ў літаратурным каноне. Асноўная задача аўтабіяграфічнага жаночага пісьма, як яна вызначаецца ў феміністкім літаратурным крытыцызме, – гэта задача самарэпрэзентацыі гендарнага (жаночага) «я». Асноўныя параметры жаночай аўтабіяграфіі як жанра, што вылучае феміністкі літаратурны крытыцызм, наступныя:

1) У жаночым аўтабіяграфічным пісьме ўсё жаночае жыццё варта апісання, а не толькі вызначальныя этапы гэтага жыцця. Адной з асноўных тэм жаночай аўтабіяграфіі з'яўляецца тэма дому і сям'і. Лічыцца, што гэтую тэму свядома зрабіла асноўным прадметам «высокай літаратуры» і літаратурнага эксперыменту Вірджынія Вульф. Пры гэтым вырашальным сэнсавым параметрам становіцца «адсутнасць страху» казаць пра сваё цела і сексуальнасць не як пра што-небудзь другаснае і дадатковае да асноўнага аўтабіяграфічнага сюжэту, а як пра асноўнае ў ім.

2) Фармальнай прыкметай аўтабіяграфічнага пісьма застаецца пісьмо ад першай асобы. Пры гэтым асаблівасцю жаночай аўтабіяграфіі ў адрозненне ад традыцыйнага аўтабіяграфічнага пісьма з'яўляецца апеляцыя да асабістага вопыту не як да асобнага, а як да гендарнага вопыту групы.

3) У жаночым аўтабіяграфічным пісьме прысутнічае свядомае ці бессвядомае сэнсавае супрацьпастаўленне свайго ўнутранага прыватнага свету афіцыйнай гісторыі: у ім часта немагчыма вызначыць да якой гістарычнай эпохі ён належыць.

4) У фармальнай структуры тэксту замест часовай наратыўнай (апавядальнай – Т.Ф.) паслядоўнасці падзей рэалізуецца эмацыянальная паслядоўнасць; падзейнасць «вялікай гісторыі» замяняецца жаночай унутранай «афектаванай гісторыяй». Фармальнымі прыкметамі такой структуры пісьма з'яўляецца наяўнасць дэталізацый, што парушаюць звычайную структуру субардынацыі; адсутнасць дэфініцый (азначэнняў – Т.Ф.) у тэксце; багацце прасторавых апісанняў. А асноўным тыпам наратыўнага звязвання становіцца тып «і...і...і».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ